...ліятэка ...н БССР

Смерць нямецкім акупантам! | Прачытай і перадай другому

# Большэвік

Орган Капаткевіцкага РК КП(б)Б

№ 24 (766) | Пятніца, 29 кастрычніка | 1943 г.

**Доблесныя Чырвоныя войскі зламілі супраціўленне праціўніка па фронту ад Дняпра да Азоўскага мора і прасунуліся ўперад ад 10 да 30 кілометраў.**

**Слава Совецкім воінам!**

## СЛАЎНАЕ 25 ГОДДЗЕ

Сёння ўся моладзь Совецкага Саюза, гераічная Чырвоная Армія, доблесныя партызаны і партызанкі, адзначаюць слаўнае 25 годдзе Ленінска-Сталінскага Комсамола з новымі пераможнымі поспехамі ў барацьбе з азвярэлым фашызмам і творчай працай у прамысловасці і сельскай гаспадарцы.

У дні Окцябрскага пераварота, у цяжкія дні грамадзянскай вайны, у перыяд рэканструкцыі народнай гаспадаркі, у дні калектывізацыі—комсамол, выконваючы самыя адказныя задачы, паказаў сябе надзейным памочнікам большэвіцкай партыі. Ленін высока цаніў моладзь, глыбока давяраў ёй. І комсамол з гордасцю носіць імя Леніна, з чэсцю апраўдваючы яго.

Чэрвень 1941 года. Чорная зграя Гітлера бандыцкі ўварвалася на нашу родную зямлю. Перад пагрозай стала наша Радзіма. У гэтыя дні комсамол сваіх сыноў адправіў на фронт.

На заклік правадыра народаў тав. Сталіна, аб арганізацыі партызанскіх атрадаў у тылу ворага, разам з комуністамі адгукнуліся і комсамольцы. Маладыя комсамольцы нашага раёна Рыгор Ц., Сяргей Ш., Трахім Г., Рыгор С. і др. першыя пайшлі ў атрад, каб са зброяй у руках адстайваць незалежнасць сваёй Радзімы.

Комсамольцы і несаюзная моладзь у партызанскім руху займаюць віднае месца. З'яднанне і выхаванне байцоў, умацаванне жалезнай дысцыпліны і парадку ў падраздзяленнях, авалоданне вайсковай справай і метадамі партызанскай барацьбы—пытанні, над якімі паўсядзнеўна працуюць комсамольцы нашага раёна. У гераічнай барацьбе на фронце і ў тылу ворага пакрыў сябе неўвядаемай славай Ленінскі Комсамол.

Народ ніколі не забудзе комсамольцаў брыгады Алеся Ж., Рыгора Т. і Васіля В., якія гераічна змагаюцца з нямецкімі акупантамі. З камандзіраў падрыўных груп яны выраслі ў камандзіраў атрадаў.

За час прабывання ў атрадзе Рыгор Т. з невялікай групай таварышоў—5 чалавек—пусціў пад адкос 16 варожых эшалонаў, а падрыўнікі і дыверсанты, якімі ён кіруе,—звыш 47 эшалонаў. Больш 16 эшалонаў пусціў пад адкос і баявы камандзір Васіль В. з сваімі таварышамі. Партыя і Урад высока ацанілі іх дзеянні.

Комсамольцы Валодзя П., Васіль Б., Сяргей Ш., Іван Ю., Рыгор Ц. і Рыгор С. таксама ўзнагароджаны ордэнамі і медалямі Саюза ССР.

Чырвоная Армія вызваляе родную Беларусь. У гэтыя дні комсамол яшчэ з большым натхненнем вядзе барацьбу з нямецкімі захопнікамі, аддае ўсё для перамогі.

## Салют Масквы доблесным войскам

25 кастрычніка ў 22 гадзіны сталіца Радзімы Масква ад імені Радзімы салютавала нашым доблесным войскам, вызваліўшым гарады Днепрапятроўск і Днепрадзяржынск,—20 артылерыйскімі залпамі з 224 гармат.

За выдатныя баявыя дзеянні Вярхоўным Галоўнакамандуючым Маршалам Совецкага Саюза Сталіным аб'яўлена падзяка ўсім войскам, якія ўдзельнічалі ў баях за вызваленне гарадоў Днепрапятроўск і Днепрадзяржынск.

## На франтах Айчыннай вайны

(З 21 па 28 кастрычніка)

На працягу 27 кастрычніка ў раёне паўднёва-усходней ніжняга цячэння Дняпра нашы войскі ў выніку жорсткіх баёў зламілі супраціўленне праціўніка па фронту ад Дняпра да Азоўскага мора і прасунуліся ўперад ад 10 да 30 кілометраў, занялі звыш 90 насялёных пунктаў.

Войскі Чацвертага Украінскага фронта, пасля многадзённых жорсткіх баёў, 23 кастрычніка поўнасцю авалодалі горадам і чыгуначнай станцыяй МЕЛІТОПАЛЬ, важнейшым і сільна ўмацаваным вузлом праціўніка.

Войскі Трэцяга Украінскага фронта, пры рашаючым садзейнічанні з флангаў войск Другога Украінскага фронта, 25 кастрычніка з баямі авалодалі абласным цэнтрам Украіны горадам ДНЕПРАПЯТРОЎСК і горадам ДНЕПРАДЗЯРЖЫНСК, а таксама занялі больш 40 насялёных пунктаў.

Паўднёвее і паўднёва-усходней гор. Крэменчуг нашы войскі працягвалі наступленне і, прасунуўшыся ўперад, авалодалі раённым цэнтрам Днепрапятроўскай області горадам ВЕРХНЕДНЯПРОЎСК, а таксама занялі больш 100 насялёных пунктаў.

Паўночнее Кіева і паўднёвее горада Пераяслаў-Хмельніцкі нашы войскі, адбіваючы контратакі буйных сіл пяхоты і танкаў праціўніка, працягвалі весці бай па расшырэнню плацдарма на правым беразе Дняпра і палепшылі свае пазіцыі.

Паўднёвее Рэчыцы нашы войскі, працягваючы весці баі па расшырэнню плацдарма на правым беразе ракі Днепр, авалодалі 8-ю апорнымі пунктамі праціўніка.

# БАЯВЫМІ СПРАВАМІ СУСТРЭЛІ 25-ГОДДЗЕ ЛЕНІНСКА-СТАЛІНСКАГА КОМСАМОЛА

## К дню Ленінска-Сталінскага Комсамола

Бліскучыя вынікі работы паказалі комсамольцы і беспартыйная моладзь атрада Рыгора Т., падыходзячы к дню 25-ай гадавіны ВЛКСМ.

Натхнёныя Зваротам Прэзідыума Вярхоўнага Совета, Совета Народных Камісараў і Цэнтральнага Камітэта КП(б)Беларусі, а таксама поспехамі Чырвонай Арміі, група комсамольца Пятра П. за апошні месяц пусціла пад адкос 3 варожых эшалоны з жывой сілай і тэхнікай. Групы Віктара С. і Ісака Х. пусцілі пад адкос 2 варожых эшалоны. Ад іх рук сотні гітлераўцаў знайшлі сабе магілу на палескай зямлі.

Многа такіх комсамольцаў як Пятро П., Віктар С. і Ісак Х. у атрадзе Рыгора Т. Усе яны люта ненавідзяць ворага і напоўнены прагай помсты.

Падарункам к дню 25 годдзя ВЛКСМ, толькі за апошні месяц, атрад пусціў пад адкос 9 эшалонаў ворага, абстраляна 12 эшалонаў. Пад абломкамі і ў выніку абстрэла забіта звыш 107 бандытаў і ранена больш 217. Выведзена са строю 12 паравозаў і 4 грузавых аўтамашыны, узарвана 210 рэльсаў.

ІВАН Г.
Атрад Рыгора Т.

## Выхаванец комсамола

Комсамолец Лявон С.—статны і бравы хлапец. Маладцаваты фізічны склад і акуратная ваенная выпраўка, гавораць за яго бясстрашша і мужнасць у барацьбе з нямецкімі бандытамі. Лявона любяць і паважаюць у атрадзе.

З першых дзён сваёй партызанскай дзейнасці паказаў сябе як кемлівы кулямётчык. У піцкай аперацыі ён першым прарваўся к масту і беспярэпынна паліваў агнём вокны варожай казармы.

Амаль ні адной баявой аперацыі не прапусціў Лявон. Днём і ноччу не дае спакою фашысцкім захопнікам. Загады сваіх камандзіраў ён чотка і своечасова выконвае.

К дню 25 годдзя Ленінска-Сталінскага Комсамола Лявон на сваім баявым рахунку мае 4 спушчаных эшалоны з тэхнікай і жывой сілай. 3 эшалоны абстраляна.

На комсамольскім сходзе Лявон заявіў:—Я буду неўстанна змагацца з фашысцкімі мярзотнікамі да таго часу, пакуль гэтай нечысці не астанецца і следу на савецкай зямлі.

Атрад тав. П. Т. ЛОПУХАЎ

## Падарункі комсамольцаў

Баявымі справамі сустрэла 25 гадавіну Ленінска-Сталінскага Комсамола моладзь партызанскага атрада „Ленінскі Комсамол“.

Толькі за апошні месяц комсамольцамі і несаюзнай моладдзю атрада абстраляна 18 эшалонаў, ідучых на фронт, і 1 эшалон пушчан пад адкос.

Асабліва сябе паказалі на абстрэле эшалонаў комсамольцы Андрэй Ж., Павел Б., Мікалай Д. і другія.

МІКАЛАЙ К.—
партызан адрада тав. В.

## Знішчыў пяць фашыстаў

Прабіраючыся скрозь лясныя зараснікі, падрыўная група Герасіма Б. падышла да чыгункі. Ноч была месячная. Відна як, згорбленыя ад холаду, мадзьяры патруліравалі па чыгуначным палатну.

Выбраўшы зручны момант, Герасім падлажыў рычажную міну і, замаскіраваўшы шнур, адпоўз на наглядальны пункт.

Калі сонца падня лося над лесам, фашысцкія патрулі заўважылі міну і сталі збірацца вакол яе.—Не выйдзе ваш нумар,—прамовіў пра сябе Герасім,—і рэзка рвануў за шнур. Раздаўся выбух. Пяць фашысцкіх грабежнікаў знайшлі сабе сабачую смерць.

ВАСІЛЬ П.—
атрад „Ленінскі Комсамол“

## Абстралялі 3 эшалоны

Група партызан з атрада тав. В., пад камандаваннем комсамольца камандзіра роты Паўла Л., у падарунак к дню 25 годдзя Ленінска-Сталінскага Комсамола за дзень абстраляла 3 варожых эшалоны. Выведзена са строю 3 паравозы.

Бясстрашна дзейнічалі пры абстрэле партызаны Кірыл Р. і Іван К.

ЛЯВОН Ф.—
партызан атрада тав. В.

## Адказваюць канкрэтнымі справамі

Разам з партызанамі сяляне вёскі З. рыхтуюць дастойную сустрэчу Чырвонай Арміі. Дзесяткі тон збожжа і бульбы сяляне далі народным мсціўцам. Астатняе надзейна захавана ад фашысцкай саранчы.

На абмеркаванні Звароту Прэзідыума Вярхоўнага Совета, Совета Народных Камісараў і Цэнтральнага Камітэта КП(б)Беларусі, працоўныя аднадушна заявілі: не пашкадуем ні сіл, ні жыцця для дапамогі нашай роднай вызваліцельніцы—Чырвонай Арміі. Зробім нашы лясы і дарогі магілай для немцаў.

На другі дзень пасля абмеркавання звароту, сяляне дружна прыступілі к рабоце па перакопванню і завалу дарог, і рыццю рвоў.

НІКАНОР Ц.—
селянін вёскі З.

## За граніцай

У Італіі на працягу ўсяго фронта англійскай 8-ай арміі, к захаду ад Мервомі, праходзяць сутычкі патрулёў. Заняты пункт Патаччато. Калі Монтэныльфане адбіта варожая контратака.

Бой за раку Вальтурна закончыўся. Амерыканская 5-ая армія прадаўжала прасоўвацца ўперад. Заняты пункты Драгоні і Рокармано.

Рэдакцыйная калегія.

Выданне Капаткевіцкага РК КП(б)Б